# Абагульненне па тэме «Развіццё сусветных цывілізацый у Познім сярэднявеччы. Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага»

## Працуем з паняццямі

**1.** А. Устанавіце гістарычнае паняцце па яго вызначэнні. Развіццё якой сферы грамадства яно характарызуе?

| Палітычная сфера | Сацыяльна-эканамічная сфера |
|---|---|
| | |

1. Паселішча, якое займае прамежкавае становішча паміж горадам і вёскай. 2. Пануючае прывілеяванае саслоўе ў Вялікім Княстве Літоўскім. 3. Асноўная павіннасць цяглых сялян. 4. Выбарны адміністрацыйны і судовы орган гарадскога самакіравання ў гарадах, якія атрымалі магдэбургскае права. 5. Найвышэйшы орган дзяржаўнай улады ў ВКЛ, у які ўваходзілі галоўныя службовыя асобы дзяржавы, каталіцкія біскупы, буйны́я феадалы. 6. Заканадаўчы акт у ВКЛ, якім вялікія князі давалі або пацвярджалі асаблівыя правы пэўных груп насельніцтва. 7. Дарадчы, а з XVI ст. галоўны заканадаўчы орган ВКЛ. 8. Галоўная павіннасць асадных сялян. 9. Гарадскі судовы орган па крымінальных справах. 10. Самае шматлікае саслоўе ў ВКЛ. 11. Будынак, у якім размяшчаліся органы гарадскога самакіравання. 12. Службовая асоба, якая ажыццяўляла кіраўніцтва дзяржаўнымі справамі. 13. Кіраўнік дзяржавы, найвышэйшы княжацкі тытул у ВКЛ. 14. Форма праўлення ў Вялікім Княстве Літоўскім. 15. Карэнныя жыхары гарадоў, вольныя ад феадалаў. 16. Сацыяльная група, прадстаўнікі якой маюць пэўныя юрыдычна замацаваныя правы і абавязкі, што перадаюцца ў спадчыну. 17. Частка горада, якая знаходзілася пад уладай магната або царкоўнай арганізацыі і не падпарадкоўвалася адміністрацыйнай і судовай уладзе магістрата. 18. Найвышэйшая службовая асоба ў горадзе. 19. Аб'яднанне, саюз. 20. Саслоўе, прадстаўнікі якога займаліся рэлігійнай і культурна-асветнай дзейнасцю.

Б. Ахарактарызуйце палітычнае або сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель (на выбар) у складзе Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XIII — XV ст., выкарыстоўваючы атрыманыя адказы.

**2.** Выявіце лагічную сувязь паміж паняццямі, змешчанымі ў розных слупках, падабраўшы адпаведныя пары слоў. Звярніце ўвагу, што некаторыя словы з другога слупка могуць не выкарыстоўвацца. Растлумачце свой выбар.

| | |
|---|---|
| *панегірычная літаратура, гандаль, прыгоннае права, саслоўна-прадстаўнічыя органы, саслоўе, народнасць, цяглыя сяляне, ураднікі, унія, замак-кастэль* | *прасал, чынш, Гародла, этнічная самасвядомасць, «Пахвала Вітаўту», паншчына, Радзівілаўскі летапіс, ратуша, Крэва, сойм, канцлер, даніна, прывілей Казіміра, Гародня* |

**3.** Складзіце разгорнуты план адказу па тэме: «Асноўныя тэндэнцыі развіцця Беларусі ў Познім сярэднявечы». Канкрэтызуйце кожную тэндэнцыю гістарычнымі фактамі.

## Чытаем і пераўтвараем розныя віды тэкстаў

**4.** На аснове прапанаваных дакументаў вызначце, пра якую гістарычную асобу ідзе гаворка.

1) *З «Летапісца вялікіх князёў літоўскіх», XV ст.*

*«Хіба мажліва апісаць моц і адвагу гэтага слаўнага валадара? Гэтаму князю... было дадзена трымаць вялікае княства Літоўскае і Рускае, многія іншыя землі... Каб не паказаць сваю непавагу вялікаму гасудару, з усіх зямель на ўсходзе або на захадзе прыходзілі пакланіцца слаўнаму валадару, бо ён быў цар над усёй зямлёй, і ўсе прыходзілі чыніць паклон слаўнаму цару, вялікаму князю...*

*Таксама і турэцкі цар ушанаванні вялікія з дарункамі многімі падаваў. Слаўны гасудар, дабраверны і хрысталюбны цар Канстанцінопальскі і той з ім у вялікай любові жыў. Таксама і Чэшскае каралеўства вялікую дружбу трымала са слаўным гасударом. Яшчэ і данскі кароль вялікую пашану выказваў, і дары многія падносіў слаўнаму валадару... У тыя ж гады брат яго*



*Помнік у г. Гродна*

*Ягайла, па-польску званы Уладзіславам, трымаўшы прастол Кракаўскага каралеўства, і той з ім у вялікай любові жыў. Таксама і іншыя цары ўсходнія служылі яму. Так, вялікі князь маскоўскі ў вялікай любові жыў з ім. Яшчэ многія вялікія князі нямецкія служылі яму са ўсімі сваімі гарадамі і землямі».*

*2) Ён, двуадзіны ў асобе вялікага князя —*
*Факельшчык войнаў са слабым, а з дужым анёл-міратворац —*
*Ставіў аголены меч свой, як слуп пагранічны,*
*Перад нашэсцямі ворагаў з поўдня і ўсходу.*
*Мікола Гусоўскі. «Песня пра зубра».*

3) Італьянскі гісторык *Эней Сільвій* назваў яго *«Крывавы рэзнік»*.

4) *«Муж, лепшага за якога Літва не мела»*, — сказаў вядомы дыпламат і пісьменнік XVI ст. *Сігізмунд Герберштэйн*.

5) *«Вялікім было ў свой час яго імя»*, — адзначаў *Папа Рымскі Пій II*.

А. Прывядзіце факты, якія маглі быць падставай для такіх характарыстык гэтага гістарычнага дзеяча.

Б. Успомніце, з якімі падзеямі ў жыцці дадзенай гістарычнай асобы звязаны прадстаўлены замак.



В. Якія мэты ставіў князь у сваёй палітыцы? Якімі шляхамі іх дасягаў?

Г. Ахарактарызуйце перыяд праўлення вялікага князя літоўскага, абапіраючыся на картасхему (с. 107).

Д. Абапіраючыся на ўсе прапанаваныя крыніцы інфармацыі, складзіце кароткую гістарычную даведку пра гэтага гістарычнага дзеяча для навукова-папулярнага часопіса.




*Вялікае Княства Літоўскае ў канцы XIV — першай палове XV ст.*

## Аналізуем, тлумачым, разважаем

**5.** Знайдзіце лішні элемент у кожнай групе. Вызначце, што аб'ядноўвае астатнія.

1) Захопы, дыпламатыя (дамовы), царкоўныя пажалаванні, шлюб.

2) Адпрацовачная, рэчавая, грашовая, прадуктовая.

3) «Чэлядзь нявольная», цяглыя сяляне, «людзі пахожыя», «людзі непахожыя».

4) 1385 г., 1392 г., 1401 г., 1413 г.

5) Лаўнікі, бурмістры, ваявода, радцы.

6) Літвіны, палешукі, беларусцы, русіны.

7) 1314 г., 1348 г., 1362 г., 1410 г.

8) Мова, крывічы-палачане, этнічная тэрыторыя, самасвядомасць.

9) Шляхта, мяшчане, духавенства, рабы, сяляне.

10) Паломніцкая літаратура, Тураўскае евангелле, «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх», панегірычная літаратура.

## Параўноўваем

**6.** Параўнайце уніі Вялікага Княства Літоўскага з Польшчай паводле прапанаванага плана. Зрабіце вывад.

| План для параўнання | Крэўская унія | Віленска-Радамская унія | Гарадзельская унія |
|---|---|---|---|
| Прычына падпісання | | | |
| Дата | | | |
| Месца падпісання | | | |
| Умовы | | | |
| Вынікі | | | |

**7.** Параўнайце становішча і ролю розных сацыяльных груп насельніцтва ў Познім сярэднявеччы. Запоўніце табліцу.

| | Вялікае Княства Літоўскае | Краіны Заходняй Еўропы | Візантыя | Маскоўскае вялікае княства | Усходнія дзяржавы |
|---|---|---|---|---|---|
| Феадалы | | | | | |
| Духавенства | | | | | |
| Сялянства | | | | | |
| Гараджане | | | | | |

## Сістэматызуем веды

**8.** А. Растлумачце, якія з адметных рысаў развіцця Вялікага Княства Літоўскага сфарміраваліся пад заходнееўрапейскім уплывам, а якія былі вынікам старажытнарускай спадчыны і мелі падабенства з рысамі развіцця Маскоўскага вялікага княства. Свой адказ падмацуйце канкрэтнымі прыкладамі.

| Заходняя Еўропа | Адметная рыса развіцця Вялікага Княства Літоўскага | Маскоўскае вялікае княства |
|---|---|---|
| | Панаванне гатычнага стылю ў архітэктуры | |
| | Пашырэнне магдэбургскага права | |
| | Называнне кіраўніка дзяржавы «вялікім князем» | |
| | Стварэнне і дзейнасць сойма | |
| | З'яўленне цэхавых арганізацый | |
| | Самастойна вылучаная рыса | |

Б. Вылучыце ўнікальныя рысы і асаблівасці ў развіцці Вялікага Княства Літоўскага. Растлумачце, якое значэнне яны мелі для развіцця ВКЛ і Усходняй Еўропы ў цэлым.

**9.** Якімі падзеямі / з'явамі / працэсамі вы б дапоўнілі стужку часу ў пачатку дадзенага раздзела? Прапануйце форму для іх абазначэння (карта, карціна, фотаздымак, цытата, фрагмент крыніцы, дата і інш.).